# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА “Рух “За Свабоду”. Выпуск № 6 ліпень 2011

*Замест доляраў – відовішчы* – с.2

*“Лукашэнку ўжо не вераць, а апазіцыі не вераць яшчэ”* – с.3

*Гульні з прыватызацыяй* – с.5

*Лагвінец: Буду балатавацца, пакуль не выйграю* – с.6-7

# Мікіта Ліхавід: Хутка ўсё зменіцца!

**Напрыканцы чэрвеня – напачатку ліпеня актывісты Руху “За Свабоду” правялі ў прыкладна трыццаці раёнах Беларусі інфармацыйную кампанію ў падтрымку свайго паплечніка Мікіты Ліхавіда. Хлопца асудзілі за Плошчу на 3,5 года калоніі.**



Але ўладам і гэтага мала: там, у Наваполацкай калоніі №10, на Мікіту аказвацца дадатковы ціск. За паўтара месяца яго ўжо чатыры разы зачынялі ў штрафны ізалятар – за тое, што называецца незаконна асуджаным і адпаведна адмаўляецца выконваць некаторыя турэмныя правілы. Дасведчаныя ж людзі кажуць, што па шкодзе для здароўя доўгае знаходжанне ў карцары раўназначнае галадоўцы.

Маці палітвязня Алена Ліхавід распавядае, што ад яе сына цягам апошніх месяцаў за кратамі засталася каля паловы – нагэтулькі ён схуднеў. Але не здаецца!

Вось што Мікіта напісаў у лісце на волю:

“...Мама, вось тут у газеце чытаў, што ў краіне поўны калапс! Вельмі перажываю, як вы там, як усе нашы. Адбылося тое, да чаго ўсё і ішло. Пытанне толькі: што яшчэ адбудзецца, што будзе далей? Цяпер настаў ваш час сказаць свае слова. Час тых, хто доўга маўчаў усе гэтыя гады, хаваючы свой страх за маскай занятасці (“бо мне сям’ю карміць”), за службовым становішчам. Час вам сказаць свае важкае слова, падняць вочы і сказаць што “хопіць выціраць аб нас ногі! Мы людзі, даем уладу і мы ж яе забіраем. Мы, грамадзяне Беларусі, і ніхто іншы!” Вельмі шкада, што я зараз знаходжуся тут і не магу быць побач з вамі.

...Хутка ўсё зменіцца!

... Хутка буду! :)

Жыве Беларусь!”

Мэта кампаніі салідарнасці з Мікітам Ліхавідам – дамагчыся не проста людскага стаўлення да яго ў калоніі, а поўнага вызвалення.

У выпадку, калі адміністрацыя Наваполацкай калоніі не адрэагуе і не спыніць дадатковы паслясудовы пераслед рухаўца, будзе зроблены зварот да Еўразвяза ўключыць яе прадстаўнікоў ў спіс неўязных на сваю тэрыторыю. Разам з тым пра лёс Мікіты Ліхавіда і іншых палітвязняў будуць інфармавацца асобныя палітыкі і арганізацыі за мяжой, ад якіх залежыць вырашэнне пытання наконт выдзялення крэдытаў для Беларусі.

P.S. Нагадаем, падтрымаць палітвязня можна дасыланнем лістоў на адрас:

***Мікіту Ліхавіду***
***вул. Тэхнічная, 8***
***Выпраўленчая Калонія № 10***
***211440, г. Наваполацк***




Можна напісаць і тамтэйшай адміністрацыі – нагадаць, што за ўсё давядзецца сплочваць:

***Начальніку Выпраўленчай Калоніі № 10***
***Сівоху Аляксандру Мікалаевічу***
***вул. Тэхнічная, 8***
***211440, г. Наваполацк***

Ці затэлефанаваць туды: прыёмная начальніка: тэл./факс (8-02145) 557127, кадравы апарат: тэл. (8-02145) 77143, 77130

# Замест долараў – відовішчы

**Лукашэнка пракаментаваў заклік Руху “За Свабоду” адмовіцца падчас крызісу ад правядзення 3 ліпеня ў Мінску ваеннага парада: “Людзі хочуць не толькі хлеба, але і відовішчаў”.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Салют ён ацаніў 10-15 тысяч долараў, а “калі гаварыць агулам пра кошт усіх мерапрыемстваў, то гэта капейкі”.

Ён лічыць неабходным правядзенне ваенных парадаў з удзелам танкаў і самалётаў: “Дзякуй богу, што паказалі. Гэта значыць, што іх памылі, аднавілі да лепшага ўзроўню, чым яны выйшлі з завода… Наш чалавек павінен ведаць, што мы можам яго абараніць”.

А раней, напярэдадні парада ў сваім артыкуле, апублікаваным у “Белорусской военной газете”, начальнік упраўлення інфармацыі – прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы Міністэрства абароны Беларусі палкоўнік Уладзімір Макараў пісаў: “Мы спецыяльна палічылі, як можна было б выкарыстаць сродкі, што выдзяляюцца ў межах ваеннага бюджэту на парад войскаў, і атрымалі яўна несуцяшальныя для апазіцыянераў вынікі. Аказваецца, прапанаваная імі эканомія сродкаў дастатковая, каб выдаць не больш чым па 10 грамаў каўбасы кожнаму жыхару рэспублікі. Вось яна – мара апазіцыянераў – запаветная каўбаса, якую злая дзяржава адняла ў свабодных людзей, якія пухнуць з голаду”.

У заяве Руху “За Свабоду” наконт адмены ваеннага парада гаварылася: “*Па віне ўладаў Беларусь сёння знаходзіцца ў глыбокім эканамічным і палітычным крызісе. Аднак някруглая дата 3 ліпеня (Мінск ад фашыстаў у гэты дзень вызвалялі ў 1944 годзе) будзе на шырокую нагу святкавацца як Дзень Незалежнасці (незалежнасці ўлады ад народу?). Рыхтуецца правядзенне параду з ваеннай тэхнікай: па цэнтры сталіцы праедуць баявыя машыны часоў Другой сусветнай вайны і сучасныя мадэлі, а ў неба на шоў-палёты ўздымуцца самалёты.*

*Рух “За Свабоду” заклікае адмяніць пампезны ваенны парад у гэты нялёгкі для краіны і яе грамадзянаў час. Дзяржава ў каго толькі можна просіць крэдытаў, не аддаўшы яшчэ мільярды долараў папярэдніх пазыкаў, узровень жыцця беларусаў імкліва падае, а ўлады недарэчна ладзяць дарагое мерапрыемства.*

*Ва ўмовах такога неабгрунтаванага і марнатраўнага шыкавання беларусы маюць поўнае маральнае права разам з ушанаваннем памяці загінулых за Беларусь, выказаць свой пратэст кіраўніцтву краіны, якое працягвае жыць не сродках і спавядае няхітры прынцып – залагодзіць народ відовішчамі*”.

Пра відовішчы, як бачым, мы трапілі ў кропку. Між тым, пазіцыя многіх жыхароў Мінска аказалася салідарнай з заявай Руху: па ацэнках журналістаў, за парадам назірала нашмат меней людзей, чым мінулымі гадамі. Уражваў іх і стан асфальту пасля баявых машын…

# Ці можа быць самаабарона ад асобаў у цывільным?

Рух “За Свабоду” звярнуўся ў МУС Беларусі ў сувязі з тым, што «апошнім часам фіксуюцца шматлікія факты нападу невядомых грамадзян на мінакоў ў розных гарадах краіны. Людзі ў цывільным, ужываючы грубую фізічную сілу, хапаюць мірных грамадзян і, у некаторых выпадках збіваючы іх, зацягваюць у аўтамабілі, аўтобусы (часцяком без нумароў) або транспартныя машыны спецназа. Пасля гэтага іх дастаўляюць у аддзяленні міліцыі, дзе паведамляюць пра тое, што яны з’яўляюцца затрыманымі ў рамках адміністрацыйнага працэсу”.

Практыка такіх затрыманняў у дачыненні да грамадзян, якія рэалізуюць свае права на свабоду слова і свабоду мірных сходаў: супярэчыць зместу арт. 9 Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека: “Ніхто не можа быць падвергнуты адвольнаму арышту або затрыманню”; грубым чынам парушае канстытуцыйныя правы і свабоды чалавека; у сур’ёзнай ступені пазбаўляе чалавека сродкаў абароны і працэсуальных гарантый справядлівага разбіральніцтва.

Намеснік старшыні Юрась Губарэвіч звярнуўся ад імя арганізацыі ў МУС Беларусі з наступнымі пытаннямі:



PHOTO.BYMEDIA.NET

Першае. Якія законныя сродкі самаабароны могуць быць ужытыя мірнымі грамадзянамі ў дачыненні да невядомых асобаў, якія нападаюць на іх?

Другое. Якія законныя сродкі самаабароны могуць быць ужытыя мірнымі грамадзянамі ў выпадку, калі нападнікі з’яўляюцца пераапранутымі ў грамадзянскую вопратку супрацоўнікамі падраздзяленняў МУС, але пры затрыманні мірных грамадзян не выконваюць прадугледжаную законам працэдуру затрымання, часам ужываючы пры гэтым фізічную сілу і спецыяльныя сродкі?

І трэцяе. У выпадку, калі затрыманне мірных грамадзян ажыццяўляюць супрацоўнікі падраздзяленняў МУС, але пры гэтым незаконна прымяняюць фізічную сілу і спецыяльныя сродкі, не выконваюць прадугледжаную законам працэдуру затрымання, якія законныя сродкі самаабароны могуць быць ужытыя мірнымі грамадзянамі ў адказ на заведама незаконныя дзеянні супрацоўнікаў МУС?

# Мілінкевіч: Лукашэнку ўжо не верацъ, а апазіцыі не верацъ яшчэ

**Аляксандр Мілінкевіч, лідар Руху “За Свабоду”, распавёў вядомаму расійскаму часопісу “Огонек” пра тое, як можа развівацца сітуацыя ў Беларусі. Найперш там пацікавіліся, у якой ступені беларуская эканоміка завязаная на суседзяў.**



– Беларуская эканоміка завязаная ў першую чаргу на вялізныя датацыі. Яна цэнтралізаваная, у асноўным дзяржаўная. Па сутнасці, гэта эканоміка, якая так і засталася сацыялістычнай з невялікімі капіталістычнымі элементамі, яна не рэфармавалася ніколі. Вакол нас, у суседзяў, ідуць рэформы – лепш ці горш, але ідуць, а наша эканоміка становіцца ўсё менш канкурэнтаздольнай...

Лукашэнка прызвычаіўся жыць на датацыі. Да гэтага часу дзякуючы асабліваму таленту выпрошваць яму гэта ўдавалася. Расія падтрымлівала Беларусь як саюзная дзяржава, але, падобна да таго, яе цярпенне вычарпалася. Ды і расійскі рынак напаўняецца ўсё больш якаснымі таварамі, а гэта значыць, што і там выцясняюцца тавары з Беларусі. Інакш і быць не можа: дырэктывы больш не дзейнічаюць, а льготныя ўмовы Лукашэнка страціў. Эксперты лічаць, напрыклад, што трэба каля мільярда долараў у месяц, каб беларуская эканоміка ажыла і пачала развівацца. А такіх грошай няма і ўжо не будзе.

**– Што могуць даць сувязі з Польшчай?**

– Яны сапсаваліся. Польшча, як і ўсе краіны Еўразвяза, ставіць зараз і палітычныя ўмовы. Перш за ўсё – вызваленне палітвязняў. Прыпыненыя маса праектаў, якія развіваліся нядрэнна. Чакаць, што польскі бізнес у цяперашняй сітуацыі пойдзе ў Беларусь, – гэта ўсё роўна што чакаць у мора надвор’я. Палякі і раней ішлі да нас з аглядкай: гарантыі уласнасці няма, прыватызацыі зямлі – таксама.

**– Вы знаёмыя з многімі эмігрантамі і ўцекачамі. Наколькі вострa стаіць перад Беларуссю праблема міграцыі?**

– Ёсць розныя хвалі. Хвалі палітычныя звычайна звязаныя з выбарамі і рэпрэсіямі з боку ўлады. У 2006-м, напрыклад, праз турмы прайшлі больш за тысячу чалавек – яны адседзелі кароткія тэрміны. Пасля выбараў 2010-га, наколькі я ведаю, у зняволенні апынуліся каля 700 чалавек, але больш за 40 з іх ужо прайшлі па крымінальных справах. Да таго ж многія, не чакаючы прыезду аўтазакаў, хаваюцца. Вільня, Прага, Кіеў, Варшава – вось напрамкі нашай палітэміграцыі.

Іншая справа, што эканамічная эміграцыя цяпер значна маштабней. Прадпрымальнікі сярэдняй рукі, нават пасляховыя, згортваюць справы ў Беларусі. Нельга нармальна купіць валюту, на біржы курс вар’яцкі. Дадайце да гэтага рэпрэсіі падатковых органаў. З бізнесменаў дзяруць тры скуры: патрабуюць план, а калі яго няма – бязлітасныя штрафы. У людзей рукі апускаюцца. Вось і з’язджаюць.

**– На Глабальным форуме ў Вроцлаве вы абмовіліся, што беларуская апазіцыя таксама ў немалой ступені вінаватая ў тым становішчы, у якім знаходзіцца цяпер ваша краіна.**

– Вядома, мы вінаватыя. Перш за ўсё ў тым, што не прапанавалі грамадству сур’ёзную пазітыўную альтэрнатыву. Маральную альтэрнатыву прадставілі: не хочам жыць у несвабоднай краіне, дзе не выконваюцца правы чалавека і няма сумленных выбараў. Але добрай эканамічнай і сацыяльнай альтэрнатывы не было. Так, праграмы нібыта ва ўсіх ёсць. Але яны не папулярызаваліся, не дайшлі да людзей. Вось на нас і глядзяць, як на дысідэнтаў. Маўляў, добрыя хлопцы, сумленныя, смелыя, змагаюцца. Але не сапраўдныя палітыкі, на якіх можна паставіць, каб вывесці краіну на дарогу рэформаў. І цяпер такая сітуацыя: Лукашэнку ўжо не вераць, а апазіцыі не вераць яшчэ.

**– Якімі вы бачыце будучыя адносіны Расіі і Беларусі?**

– Як я разумею, у Маскве ўжо не бачаць у Лукашэнку стратэгічнага партнёра. Ён не стаў чалавекам слова. Да таго ж дазваляў сабе вельмі не дыпламатычныя выразы і выпады ў адрас расійскага кіраўніцтва. Думаю, Расія будзе шукаць іншага чалавека, які б адпавядаў яе інтарэсам. Не сумняваюся, што для Расіі важна, каб Беларусь засталася ў сферы яе максімальнага ўплыву. Але дамагчыся гэтага цяпер складана: выбары ж прайшлі, а на парашуце новага прэзідэнта не спусціць. Для Расіі важныя прарасійскія партыі, а іх ролю заўсёды выконваў Лукашэнка. Па сутнасці, у нас няма прарасійскіх партый, як няма і антырасійскіх. Мы хочам будаваць асновы грамадзянскай супольнасці, партыі і рухі ў нас – прадэмакратычныя. У пэўным сэнсе – празаходнія. Хоць, паўтаруся, зусім не антырасійскія.

# Прагноз на вясну-2012: голад!

**Ці задавальняе вас узровень вашага заробку пасля крызісу? Пытанне для многіх беларусаў рытарычнае. А дзе шукаць дастатковы заробак ці нармальнае новае працоўнае месца? Адной са свежых тэмаў для абмеркавання ў межах кампаніі “Народная праграма” стала “Лібералізацыя рынку працы і гарантыі па беспрацоўі”. Гэта актуальна і цяпер, у крызіс, і будзе актуальна пасля яго.**

Даследчыца рынку працы **Святлана Мацкевіч** зазначае, што эканамічны крызіс выявіў многія праблемы на ім, якія старанна хаваюцца: “Існаванне ўтоенага беспрацоўя і нефармальнай эканомікі, неадпаведнасць узроўню заработных платаў рэальнай прадукцыйнасці працы і так далей”.



У 2009-2010 гадах механізмы дзяржаўнага рэгулявання рынка працы часткова спрацоўвалі. Напрыклад, пераход на няпоўную занятасць і незапланаваны сыход у адпачынак разглядаўся грамадзянамі як часавая мера. Пры гэтым захоўвалася працоўнае месца, сацыяльныя гарантыі, а з імі і надзеі на паляпшэнне і стабільнасць. За такія палавіністыя меры неабходна плаціць. І дзяржава плаціла, а дакладней, проста марнавала і размяркоўвала бюджэт. Фактычна дзяржава плаціла не за працу, а за міф пра стабільнасць, кажа эксперт.

У 2011 годзе такі метад саўковага рэгулявання на рынку стаў немагчымы: “Паколькі плаціць стала проста няма чым. Макраэканамічны крызіс аўтаматычна цягне за сабой і крызіс на рынку працы”.

Рэзервы не гумовыя, яны рана ці позна скančаюцца: “Таму адныя прадпрыемствы і фірмы (хутчэй, прыватнай формы ўласнасці) будуць зачыняцца і звальняць супрацоўнікаў, перакладаючы рэшткі капіталу ў замежжа, а іншыя (дзяржаўныя) будуць працягваць чакаць, спрабуючы “павялічыць” прадукцыйнасць працы. Толькі як – незразумела. Можна павялічыць працоўны час, прымусіць усіх адміністрацыйнымі мерамі “пахаць”, нават парушаючы працоўнае заканадаўства, узмацніць працоўную дысцыпліну, кантралюючы прыход і сыход супрацоўнікаў, але праца ад гэтага больш прадукцыйнай не стане. Прадукцыйнасць працы вымяраецца не толькі колькасцю патрачанага часу, але і колькасцю і якасцю выробленай прадукцыі, якая нейкім чынам павінна быць прададзеная, а не стаяць на складах. І пажадана, каб была прададзеная ў стабільнай валюце”.

Паколькі хутка зарплату плаціць стане проста няма чым, а тое, што плацяць, хутка абясцэніцца, то няцяжка прадказаць катастрафічны рост беспрацоўя і сацыяльнай напружанасці, лічыць Святлана Мацкевіч. Яна можа выяўляцца ў розных формах: ад ціхіх пратэстаў на кухнях да самых бурных і стыхійных вулічных акцый. Беларусы будуць эміграваць у пошуку працы ў Расію, ва Украіну, у блізкае замежжа, будуць шукаць нішы ў нефармальнай і ценявой эканоміцы і г.д.

Унутры краіны новых працоўных месцаў практычна не паспелі стварыць, кажа Святлана Мацкевіч.



Былы міністр працы **Аляксандр Сасноў** перакананы, што дадатковыя працоўныя месцы могуць стварацца ў любых сектарах эканомікі, у тым ліку ў прыватным бізнесе: “І гэта трэба было рабіць 20 гадоў таму, як мы і казалі. Але кіраўнік краіны слухаў ткачовых, шымавых ды іншых псеўдаэканамістаў. Да гэтага мы ўсё адно прыйдзем. Іншага выйсця няма. Перспектываў у дзяржаўным сектары ў гэтым плане – мізер”.

“Што тычыцца праблемаў беспрацоўя і ўзроўню даходаў, то я спачуваю і не зайздрошчу тым, хто прыйдзе да ўлады пасля Лукашэнкі. Ім давядзецца выцягваць краіну з вельмі глыбокай ямы. Усім будзе пэўны час цяжка…”, – кажа эксперт “Народнай праграмы”.

“Весці дыскусію (тэарэтычную? практычную?) пра рынак працы не выпадае, бо мы шмат чаго не ведаем, – кажа эканаміст **Міхал Залескі**. – Напрыклад, мы не ведаем рэальнай лічбы беспрацоўных. Вось нядаўна міністр статыстыкі казаў пра 600 тысяч чалавек, але адразу гэтая заява была дэзавуяваная. Мы таксама не ведаем таго, якім чынам і кім фармуецца ўзровень зарплаты ў краіне. У нас няма прафесійных саюзаў, няма боку дамовы – наймітаў. Апрача таго, ёсць пытанне: як пойдзе прыватызацыя – па-новаму ці па-старому? Па стане на 1991 год нацыянальнае багацце Беларусі ацэньвалася ў амаль на 700 мільярдаў долараў. Не забываемся пра чэкі “Маёмасць”. Палова беларусаў, хто не скарыстаўся, маюць права іх скарыстаць альбо атрымаць грашовую кампенсацыю. Ці будзе працаваць гэты закон?”



Прагноз эксперта песімістычны : “У краіне комплексны крызіс. Трэба нешта рабіць, бо інакш наступнай вясной паўстане праблема харчовага забеспячэння. Прасцей кажучы, голаду…”.

P.S. Па гэтай ды іншых праблемах у розных сферах беларускага жыцця можна выказацца на сайце «Народнай праграмы» – Prahrama.by.

# Гульні з прыватызацыяй

Андрэй ЮРКОЎ, эканаміст

Адчуўшы для сябе пэўную небяспеку, звязаную з маўклівым бунтам вуліцы, улада агучыла “новы эканамічны курс“. Яго сутнасць: нічога ў падыходах не мяняем, але будзем весці прыватызацыю і сустракаць хлебам-соллю інвестыцыі. Паспрабуем паглядзець, так мовіць, знутры на гэтыя працэсы.

Перш за ўсё трэба вызначыць галоўную мэту заанансаваных пражэктаў. У прынцыпе, згаджаючыся на прыватызацыю пад ціскам крызісу, кіраўніцтва краіны наступае на горла сваёй улюбёнай савецкай песні і адначасова прызнае банкруцтва існуючага эканамічнага ладу. Але плаціць за гэтыя памылкі, па логіцы ўлады, мусіць сам народ.

Разгледзім у якасці прыкладу дзеянні нашых прыватных і дзяржпрадпрыемстваў. Не сакрэт, што нешматлікія пакуль прыватныя прадпрыемствы працуюць больш эфектыўна, чым дзяржаўныя. Дасягаецца гэта, як правіла, толькі за кошт лепшай матывацыі і адноснай свабоды ў прыняцці рашэнняў. Падкрэсліваю, асноўны чыннік – матывацыя і свабода кіравання. Нават на дзяржпрадпрыемствах кіраўнікі , якія працуюць за ідэю, жывуць сваёй працай, атрымліваюць вынікі не горшыя за прыватнікаў. Але пры адсутнасці матывацыі такі ход спраў – выключэнне. Прыватныя ж пратпрыемствы ствараюцца шляхам прыватызацыі ў нас толькі са згоды ўладаў і знаходзяцца фактычна пад яе патранатам. І, безумоўна, знаходзяцца ў прывеліяваным становішчы.

Факрычна карціна ў нашай эканоміцы сёння выглядае так. Асноўная маса дзяржпрадпрыемтстваў, існуючы ў сацыялістычнай сістэме, балансуюць на мяжы банкруцтва і ледзь ліпяць дзякуючы бюджэтнаму пераразмеркаванню, а хутчэй праз друк грошаў і “інфляцыйны падатак”. Сярод іх там-сям, як краскі сярод пустазелля, квітнеюць прыватнікі, якія пры адсутнасці канкурэнцыі з боку дзяржсектара практычна могуць ствараць з дазволу ўладаў любыя магчымыя ў нашай краіне аб’ёмы прыбытку. Таму і



*...галоўная мэта нашых “прыватызатараў” – не рост эфектыўнасці, а захаванне кантролю ўладаў над эканомікай*

не спяшаецца ўлада з прыватызацыяй.

Бо будзе шмат прыватнікаў, пачнецца канкурэнцыя, а там глядзіш – і з’явіцца ў іх спакуса пасляць “вертыкаль” падалей. А так і нешматлікія бізнесмены пры справе ды на кароткім ланцужку, і народ, бачачы заняпад у эканоміцы, спадзяецца толькі на дапамогу зверху. Таму, на жаль, галоўная мэта нашых “прыватызатараў” – не рост эфектыўнасці, а захаванне кантролю ўладаў над эканомікай. Менавіта каб правесці працэс “прыватызацыі” ў вачах народу справядліва, узгадалі і пра інвестыцыі.

Таварышы прыватызатары, не смяшыце багацеяў! Ніхто ламанага цэнта не ўкладзе ў краіну, дзе кіруюць па паняцця, уведзеных у статус законаў. Ну, можа, “Газпрам” купіць трубу, бо ведае, што без яго газу яна і нам не патрэбная. Могуць набыць сотавых апаратараў ці банкі, бо грошы адносна невялікія, а прыбытак гарантаваны на дзесяцігоддзі наперад. Кітайцы могуць пабудаваць у крэдыт пад гарантыю нашага ўраду які-небудзь завод са свайго абсталявання, якое з-за невысокай якасці нікому болей не ўпіхнеш…

Рэальна прывязка прыватызацыі і інвестыцый патрэбная, каб ва ўмовах адсутнасці канкурэнцыі ўлада магла дапрыватызаваць эканоміку праз падкантрольны ёй звышпрыбытковы прыватны бізнес.

Напрыклад, гады тры таму прыватызавалі Горацкі масласырзавод. Грошай у інвестараў было кот наплакаў (завод стаў прыватным за 1,5 млн. долараў пры гадавым абароце каля 20 млн.), але якія інвестыцыйныя планы! Сабралі кіраўніцтва сельгаспрадпрыемстваў і пачалі расхвальваць уласныя задумкі. Там і тое, і гэта… Задаем адно пытанне: крыніцы фінансавання? Адказваюць: крэдыты горацкіх банкаў і будучыя прыбыткі! Усё, дастаткова...

Наогул, прыватызацыя і інвестыцыі – інструменты вельмі тонкія. Нават урады краінаў, якія шчыра хочуць рэфармаваць і зрабіць больш канкурэнтнымі свае эканомікі, сутыкаюцца з процьмай цяжкасцяў. Адна з галоўных: вынішчаны за камуністычныя гады слой працавітых, прынцыповых грамадзян. Таму і адказны чыноўнік, і кіраўнік прадпрыемства пры прыняцці рашэнняў далёка не заўсёды ставіць эканамічны эфект вышэй за ўласную мэтазгоднасць.

Атрымліваецца ў выніку, што прыватызацыя не дае плёну. Інвестыцыі – альбо пыл у вочы народу, альбо вядуць да хуткай страты эканамічнага суверэнітэту. Напрыклад, возьмем прыватызацыю “Крываросжталі” ва Ўкраіне ўрадам Юліі Цімашэнкі ў 2005 годзе. Здаецца, усё зразумела. Магнаты ад улады са старога ураду забралі сабе прадпрыемства за 1 млрд долараў. Новы ўрад прадаў праз аукцыён болей чым за 5 млрд., вярнуў 1 млрд. папярэднім “прыватызатарам”, а 4 млрд. – у бюджэт.

Усё быццам лагічна. Але, калі разважаць стратэгічна, не ўсё так бездакорна. Нацыянальны, украінскі бізнес страціў кантроль над буйнейшным прадпрыемствам, прыбыткі ад дзейнасці якога цяпер размяркоўваюць без уліку дзяржаўных інтарэсаў.

Калі нашы кіраўнікі сёння кажуць патэнцыйным замежным інвестарам (уласных задушылі даўно), маўляў, грошы на бочку – і прадпрыемствы вашыя, разумею, што крызіс яшчэ не дапёк. Бо прадаваць краіну пакуль прапануюць ураздроб. Калі яшчэ гады два-тры такой эканамічнай палітыкі, дык давядзецца прадаваць усю краіну цалкам. І, на жаль, аукцыёна чакаць не выпадае – ідэалагічных ворагаў да яго не дапусцяць.

**Што падштурхоўвае беларусаў у палітыку, чаму яны выбіраюць менавіта такі шлях? Інтэрнэт-рэсурс Telegraf.by у межах рубрыкі “Карані беларускай палітыкі” вырашыў запытацца ў беларускіх палітычных дзеячоў пра іхняе паходжанне, дзяцінства, палітычны досвед, каб неяк зразумець, чаму яны займаюцца тым, чым займаюцца. Першым сваю біяграфію распавёў дарадца лідара Руху “За Свабоду” Аляксандра Мілінкевіча, палітолаг Алесь Лагвінец.**

# Лагвінец: Буду балатавацца, пакуль не выйграю



## Родам з балота

“Нарадзіўся я ў далёкім студзені 72-га года, года, калі, здаецца, у Савецкім Саюзе найвялікшая колькасць дзяцей нарадзілася - недзе каля пяці мільёнаў. Паходжу я з вялікай усходнепалескай вёсцы Дворышча Хойніцкага раёна. Яна знаходзіцца недалёка ад Прыпяці, а таксама за 50 кіламетраў ад Чарнобыльскай станцыі.

У вёсцы на 90% размаўлялі на мове, вельмі набліжанай да літаратурнай беларускай мовы. Па вымаўленні, па структуры - гэта цалкам беларуская мова, пэўныя ж словы мяшаныя, беларуска-расейскія. Праз дзве-тры вёскі бліжэй да Прыпяці ўжо адчуваўся ўкраінскі ўплыў: там, напрыклад, казалі не “тата, мама”, а “тато, мамо”. Вельмі блізка апісаў тое жыццё, што было ў нашай вёсцы, Іван Мележ у сваіх “Людзях на балоце”. Яго вёска, дарэчы, недзе за кіламетраў 15 знаходзіцца ад маёй.

У вёсцы быў адзін з найбольш прасунутых саўгасаў, у якім трактарыстам працаваў мой бацька. Ён быў адным з перадавых работнікаў, звеняным па вырошчванні бульбы. Яму якіясьці граматы, нават ордэны і медалі давалі ў свой час. Я толькі адзін раз за ўсё жыццё бачыў бацьку п’яным. Дакладней, ён сам сказаў, што быў крыху выпіўшы. Мой бацька вельмі адказна ставіўся да алкаголю, яго практычна не ўжываў. Нават у нашай вёсцы гэта не была частая з’ява.

Маці працавала ў школьнай сталоўцы. Ад яе я, думаю, атрымаў у спадчыну здольнасць камунікавацца з людзьмі. Яна заўсёды вельмі прыязна з усімі размаўляла. Яна вельмі шчыры і адкрыты чалавек. Зараз мае бацькі на пенсіі”.

## Вясковае выхаванне

“Адна з найвялікшых гісторый у нашай вёсцы - гэта мой траюрадны брат Віктар Лагвінец. Ён быў у камандзе Лукашэнкі, быў, можна сказаць, бізнэсоўцам №1, сябраваў вельмі блізка з Іванам Ціцянковым (у 1994-1999 гадах кіраўнік справаў прэзідэнта). У 1999 годзе яго пасадзілі, забралі практычна ўсё ў Беларусі. Праседзеўшы шэсць месяцаў у турме, ён збег у Маскву. Яму далі з’ехаць.

У мяне родныя мясціны выклікаюць вельмі станоўчае эмацыйнае пачуццё. У мяне ёсць сын. Не кожны год атрымліваецца ездзіць на Радуніцу, але, калі я прыязджаю на могілкі, то мне важна перадаць сыну адчуванне сваёй зямлі і зямлі продкаў. Ня ведаю, наколькі сын гэта ўспрымае, але я лічу, што ёсць эмацыйныя, нерацыянальныя рэчы, якія ўплываюць на пачуцці людзей, і я вельмі хацеў бы перадаць стаўленне да гэтай зямлі продкаў, якая знаходзіцца на пашкоджанай тэрыторыі. Гэтая лучнасць сапраўды важная, і, спадзяюся, яна будзе захоўвацца.

працяг на с.7

працяг са с.6.

Вясковае жыццё і тое, што здарылася ў 1986 годзе, паўплывала на маё станаўленне як асобы. Нягледзячы на тое, што ў вёсцы не было царквы, у ёй кшталтавалася пэўная прыстойнасць, адказнасць, чалавечнасць. Тыя рысы, якія маю, я звязваю з маім вясковым выхаваннем і менавіта з тым атачэннем вялікай палескай вёскі.

Моцна таксама паўплывала тое, што да 12 год я далей за раённы цэнтр нікуды не выязджаў. Першы вялікі горад, які я наведаў, быў Кіеў. Самае галоўнае ўражанне, якое ў мяне ад гэтай паездкі засталося, - гэта горкі-горкі, незразумелы смак кавы. Я пра яе толькі чуў, але ніколі не частаваў дагэтуль. Зараз я вельмі люблю каву".

## Французская мова і Мілінкевіч

З-за Чарнобыльскай аварыі я з'ехаў з роднай вёскі. Бацькі засталіся, а я паехаў вучыцца ў Дуброўна ў Віцебскай вобласці. Пасля гэтага пачалося маё больш імклівае сталенне, якое прыпала на гады перабудовы, аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Відавочна, што быць сведкам гэтых падзеяў было вельмі натхняльна і вельмі цікава.

У Дуброўне я жыў у стрыечнай сястры. Там была рускамоўная школа, я адчуваў, што часам з мяне нават смяяліся, калі я выкарыстоўваў беларускае слова. Мне, дарэчы, па рускай мове чацвёрка была выніковая, хоць я вельмі старана і адказна вучыўся".

Французская мова і Мілінкевіч

"На маё станаўленне вельмі паўплывала і французская мова. У маёй вёсцы ў школе, як гэта нядзіўна, бо зазвычай у школах на вёсцы выкладаецца нямецкая мова, выкладалася французская. І так сталася, што мой лёс аказаўся звязаны з Францыяй: спачатку я паступіў на франкамоўны факультэт у ЕГУ і потым, дзякуючы яму, паехаў на два гады вучыцца ў Францыю.

Я ніколі не вучыўся на перакладчыка, але лічу адным са сваіх дасягненняў тое, што я з дзясятак міністраў замежных спраў, трох старшыняў Еўрапарламента і аднаго прэм'ера перакладаў. Я, дарэчы, і да Мілінкевіча патрапіў пасля таго, як быў перакладчыкам ягонага выступу з беларускай на французскую мову падчас уручэння яму прэміі Сахарава. І мой пераклад, як афіцыйны пераклад выступу Мілінкевіча, знаходзіцца ў архівах Еўрапейскага парламенту.



Алесь Лагвінец і Алесь Міхалевіч у 1996 годзе ў Лондане ў музеі мадам Цюсо

Я ганаруся, што сабраў у 2006 годзе кожны 130-ы подпіс за Мілінкевіча. Мы сабралі 1300 подпісаў, гэта не так і шмат, але ўсё адно".

## Балатаванне да перамогі

"Першая выбарчая кампанія ў 2004 годзе мяне пакінула ў палітыцы, бо я ўбачыў, што ёсць зваротная сувязь. У той кампаніі я мог разлічваць толькі на сябе, тым больш, што па акрузе, апроч праўладнай кандыдаткі, яшчэ ішоў Анатоль Лябедзька. Гэты факт быў для мяне дадатковым стымулам.

У палітыку мяне штурхнуў Міхалевіч, але Лябедзька лічыў, што мяне супраць яго выставіў Фронт, бо я быў у Фронце да 2004 году. Але так не было. У 2003 годзе, калі яшчэ ніхто не ведаў, хто і дзе будзе балатавацца, Міхалевіч падштурхоўваў мяне да гэтага. Заўсёды прынцып такі, што лепш за ўсё балатавацца там, дзе ты жывеш. Таму я пайшоў там, дзе я жыў. А Лябедзька не там жыў. Тым не менш, я шмат чаго ад яго навучыўся. Паколькі я блізка адсочваў тое, што ён рабіў, то я штосьці перайmaў, на штосьці рэагаваў.

Мы свядома выбралі вельмі пазітыўную кампанію. Мы раскручвалі мяне як выкладчыка, як прафесіянала, звярталі ўвагу на мясцовыя праблемы і шляхі іх вырашэння, арганізоўвалі непасрэдны кантакт. Я больш чым хто з іх у акрузе стаяў у пікетах, камунікаваў з людзьмі, абыходзіў кватэры. Мне нават здаецца, што атрымаўшы інфармацыю, што я шмат хаджу, іншыя пачалі таксама хадзіць. Нават праўладная кандыдатка стаяла ў пікетах.

Год таму я сказаў, што буду балатавацца да таго часу, пакуль не выйграю. Магчыма, так і трэба рабіць, але пры ўмове, што ёсць працэдура. Калі няма працэдуры, то часам трэба адступіцца ў бок і займацца чымсьці іншым".

# Еўрапейская школа




**Напачатку ліпеня Рух “За Свабоду” зладзіў летнюю школу “Беларусь. Еўропа. Дэмакратыя”. Навучанне прайшло ў варшаўскім каледжы Еўропы.**




Конкурс у школу склаў 2,5 чалавека на месца. Навучанне прайшлі 20 маладых беларусаў. Месца для летняй школы было абранае не выпадкова: з 1 ліпеня ўпершыню пасля далучэння да Еўрапейскага Звязу да Польшчы перайшло прэзідэнцтва ў Радзе ЕЗ. Старшынства краіны-суседкі ў Еўрапейскім Звязе – цудоўны нагода для абмеркавання пытанняў беларуска-еўрапейскіх дачыненняў.

Кіраўніца адукацыйных праектаў Руху “За Свабоду” Даша Слабчанка распавядае, што “*удзельнікі летняй школы былі актыўнымі: лекцыі не прапускалі, задавалі шмат пытанняў, кожны з іх – асоба, а разам – цудоўная каманда!*”.

Цяпер яны распрацоўваць уласныя міні-праекты – найлепшыя ідэі атрымаюць магчымасці рэалізацыі.

Выпускнікі школы, якія цягам году праявяць сябе ў сваёй галіне, змогуць пабываць у якасці лектараў падчас наступнай летняй школы.

Сёлета ведамі дзяліліся вядомыя эксперты: палітолагі Алесь Лагвінец і Андрэй Фёдараў, спецыяліст па публічнай палітыцы Ірына Віданава, эканамісты Сяргей Чалы і Сяржук Наўродскі, юрыст Юры Чавусаў, спецыяліст па кіраванні праектамі Яраслаў Бекіш. Выступалі і замежныя госці: дырэктар дэпартамента Еўропы і Еўразіі пры амерыканскім Нацыянальным фондзе падтрымкі дэмакратыі Роджэр Патоцкі і колішні амбасадар Польшчы ў Беларусі Марыуш Машкевіч.

У праграме навучання былі візіт у МЗС, сімуляцыйная гульня па візавай тэматыцы, дыскусіі.

Даша Слабчанка адзначае, што “*досвед, калі адукацыйны праект у Еўропе каардынуюць самі беларусы, апынуўся вельмі станоўчым. Важна, што нашыя навучэнцы пабачылі на ўласныя вочы, што гэта такое – навучанне ў Еўропе*”.







Газета выдаецца Рухам “За Свабоду”. Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна. Падпісана ў друк 11.07.2011 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@pyx.by